# Рэзюмэ

Дыпломная праца прысвечана даследаванню структурнай і семантычнай арганізацыі канструкцый з эліпсісам дзеяслова ў трылогіі І. Мележа "Палеская хроніка".

У рабоце зроблены агляд мовазнаўчых школ і напрамкаў, якія вывучалі праблему эліпсіса, і іх класіфікацыя паводле тэарэтычнай базы і аспекта даследавання.

Дыпломная праца змяшчае аналіз структурных разнавіднасцей канструкцый з эліпсісам дзеяслова – простых з залежнымі кампанентамі, ускладненых аднароднымі і адасобленымі членамі сказа, далучальнымі канструкцыямі, эліпсіс у поліпрэдыкатыўных адзінках. Вывучаецца роля названых кампанентаў у функцыянаванні канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

У дыпломнай працы даследуецца семантычная арганізацыя канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Выяўлены асноўныя віды эліптычных канструкцый – з семантыкай перамяшчэння ў прасторы, маўленчых працэсаў, статальнай лакалізацыі, актыўнага дзеяння. Вызначаны кампаненты эліптычнага сказа, што выступаюць у якасці паказчыка семантыкі, – акалічнасці з лакатыўным значэннем, са значэннем спосабу дзеяння, дапаўненні з аб'ектным значэннем і інш. Таксама разглядаюца і выпадкі сінтаксічнага пераўтварэння, што назіраюцца ў творах І. Мележа.

Праца мае 58 старонак друкаванага тэксту і 2 дадаткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ